# Справаздача майстроў і вучняў

*Нядаўна ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася Рэспубліканская мастацкая выстаўка працаў стыпендыятаў Міністэрства культуры 2010 года. Яе арганізавалі Міністэрства культуры, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў і Беларускі саюз мастакоў.*

У экспазіцыі прадстаўленыя творы жывапісу, скульптуры, дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, дызайну мастакоў розных пакаленняў і розных мастацкіх накірункаў. З жывапісных твораў паказаныя працы як сталых мастакоў — Сяргея Давідовіча, Віктара Нямцова, Галіны Конанавай, Юрыя Хілько, так і маладых выпускнікоў БДУ культуры і мастацтваў Елізаветы Аўчыннікавай і Аляксея Іванова. Гледачы таксама маюць магчымасць пазнаёміцца з творчасцю Таццяны Малышавай (шкло), Сяргея Аганава (скульптура) і Сяргея Саркісава (плакат).

Найболыную цікавасць у мяне выклі.кала экспазіцыя праекта «Млыны Беларусі» прафесара кафедры малюнка акадэміі мастацтваў Віктара Нямцова, размешчаная ў асобнай зале. Псршая яго праца была зробленая ў 2004 годзе на радзіме жонкі ў вёсцы Пабрэззе Навагрудскага раёна. Млын, які ён намаляваў, нрацаваў амаль да 1990 года. Вядомы мастацтвазнаўца Яўген Шунейка, калі пабачыў працу, прапанаваў зрабіць серыю карцінаў пад агульнай назваю. У выніку за 2009 і 2010 гады атрымалася мастацкае ўвасабленне гістарычнага даследавання помнікаў гістарычнай прамысловай архітэктуры Беларусі. Сёлета плануецца працягнуць гэтую серыю і арганізаваць персанальную выстаўку Віктара Нямцова.



С. Саркісаў. Плакат з серыі «Беларусь - культура - спадчына»



С. Аганаў. «Арганаўты»



В. Нщцоў каля сваёй карціны «Стары млын у з. Пабрэззе Навагрудскага раёна»

*Куліна ПРЭВІЧ, фота аўтара*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ